Камуністычная партыя (большавікоў) Беларусі

ЗЬЫЗЫ

Орган Цэнтральнага і Мінскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 15 1932 г. № 279 (4531)

Год выдаўня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

МОСКВА, Советская Площадь, Инст. Ленина при ЦК КПБ Сектор КП(б) т. НОЛИНУ. Бер. лек. / Зьв.-I /

Сеньня у нумары

АБ ПРАКТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) І СНК СССР АБ ПАВЫШЭНЬНІ УРАДЖАЙНАСЬЦІ, АБ ПЛЯНЕ І АРГАНІЗАЦЫІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ У 1933 г.—Пастанова пленуму ЦК КП(б)Б па справаздачаму дакладу Наркамзему БССР (3-4 стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Вышэй клясавую пільнасьць! Я. БАРЫСЕНКА — Творчы шлях Якуба Коласа (2-3 стар.).

ВЕРШЫ: ЯКУБ КОЛАС — Заходняй Беларусі (2 стар.).

ЯНКА КУПАЛА—Якубу Коласу (2 стар.).

0,8 проц. гадавога пляну дала апошняя пяцідзённка (1 стар.).

50-гадзьдзе народнага паэта Якуба Коласа (2 стар.).

З бальшавіцкай настойлівасьцю ажыцьцяўляць пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б (1 стар.).

Урад Зрыё падаў у адстаўку (1 стар.).

Водгукі кітайскай прэсы і грамадзтва на аднаўленьне савецка-кітайскіх адносін (1-я стар.).

Заява прадстаўніка японскага ваеннага міністэрства (4 стар.).

Вышэй клясавую пільнасьць!

БССР адстае ў выкананьні цэнтралізаваных плянаў загатовак. Заданьні па дзяржаўных загатоўках выконваюцца яўна нездавальняюча. На 10 сьнежня загатоўлена толькі 60,2 проц. збожжа (разам з насеннымі). Рад раёнаў—Чырвонапольскі, Горацкі, Рэчыцкі, Крупскі, Лоеўскі і інш. — недапушчальна зацягваюць здачу збожжа.

Апошняя пяцідзённка сьнежня дала рэкордна нізкі процант выкананьня пляну — 0,8 проц., што зьяўляецца вынікам дэмабілізацыйных настроеў і размагнічанасьці ў правядзеньні важнейшай кампаніі.

Такі-ж малюнак з ільном. Да 10 сьнежня загатоўлена ільнавалакна 27,8 проц. гадавога заданьня, ільнянога семя—59,9 проц. Прычым ільняныя раёны здалі толькі 27,1 проц. валакна. Дубровенскі і Асьвейскі раёны проста зрываюць ільназагатоўкі, выканаўшы ад 7,4 да 9,5 проц. заданьня.

БССР выканала свае абавязацельствы па адгрузцы бульбы Ленінграду, аднак, мясцовыя арганізацыі прыпынілі загатоўку бульбы для патрэб прамысловасьці і пралетарскіх цэнтраў БССР. Да 10-га сьнежня загатоўлена каля 70 проц. гадавога пляну.

Ня гледзячы на ўстанаўленьне цьвёрдых тэрмінаў і норм здачы мяса, да 1 сьнежня выканана толькі 32 проц. пляну чацьвертага кварталу.

Дзе прычыны адставаньня БССР? На гэта адказвае вопыт перадавых рэспублік і абласьцей, а таксама паасобных раёнаў БССР. Маскоўская вобласьць, Татарская АССР, Тураўскі, Жыткавіцкі і Камарынскі раёны Беларусі паказалі бліскучыя ўзоры барацьбы за выкананьне плянаў загатовак і іншых с.-г. кампаній, паказалі, што ключ да перамогі—у рашучым удары па супраціўленьні кулацтва, у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, у барацьбе з апартуністычнай практыкай у загатоўках.

Там, дзе ня была разгорнута работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, дзе працоўныя масы вёскі ня былі ўцягнуты на барацьбу з манэўрамі кулака, дзе не займаліся правядзеньнем партыйна-масавай работы, дзе дапушчана прытупленьне клясавай пільнасьці ў адносінах да клясава-варожых элемэнтаў,—там мы маем адставаньне ў ажыцьцяўленьні важнейшых сельска-гаспадарчых кампаній.

Аб чым, як не аб аслабленьні барацьбы з рэшткамі кулацтва, сьведчыць той факт, што цьвёрдыя заданьні па збожжы на 10 сьнежня спатканы толькі на 39,2 проц., што ў радзе раёнаў, наперакор закону ўрада, скажуцца збожжам.

У «Зьвязьдзе» ў радзе карэспандэнцкіх артыкулаў апісаны шматлікія факты простага патураньня кулацкаму сабатажу, зрашчваньня паасобных нізавых работнікаў з клясава-варожымі элемэнтамі, разбазарваньня і расцрадваньня калгаснага збожжа. У карэспандэнцыях з Быхаўскага і Талачынскага раёнаў, зьмешчаных у апошніх нумарох «Зьвязды», дан яркі малюнак засьмечанасьці некаторых зьвяньняў нізавога апарату кулацкімі агентамі, якія ўсімі спосабамі імкнуцца сарваць дзяржаўныя загатоўкі.

Пленум ЦК у сваёй пастанове аб загатоўках, кваліфікаваўшы прычыны адставаньня БССР, адзначыў, што «кулацкае супраціўленьне, кулацкая работа ў некаторых калгасах і сярод працоўных аднаасобнікаў маглі мець поўны ўплыў толькі ў выніку страты клясавай пільнасьці асобнымі сельскімі партарганізацыямі, засьмечанасьці апошніх клясава-варожым элемэнтам, з прычыны роззлажэньня і зьмяканьня камуністаў, якія стаяць на чале асобных загатоўчых арганізацый, сельсаветаў і калгасаў, з кулаком, і непрыняцьця своечасовых мер з боку некаторых раённых партарганізацый».

Пленум ЦК канстатаваў, што ў радзе раёнаў ня выконваецца дырэктыва партыі аб забароне канцыю збожжам да выкананьня плянаў загатовак і ссыпкі насенных фондаў і не разгорнута барацьба з кулакамі—спэкулянтамі і перакупшчыкамі збожжа.

Пленум устанавіў канчатковыя тэрміны выкананьня цэнтралізаваных плянаў загатовак—100 проц. збожжа не пазьней 25 сьнежня, 80 проц. ільнавалакна не пазьней 1 студзеня, заданьне чацьвертага кварталу па мясазагатоўках (15 тыс. цэнтн.) выканаць да 25 сьнежня.

Асноўныя ільнаводныя раёны павінны да 20 сьнежня загатовіць ня менш 70 проц. гадавога пляну.

Пастанова пленуму зьяўляецца баявой праграмай барацьбы за перамогу на фронце загатовак.

Для таго, каб ліквідаваць адставаньне ў загатоўках, неабходна разгарнуць шырокую масава-палітычную работу сярод працоўных вёскі, скарыстаць вопыт перадавых раёнаў, калгасаў і сельсаветаў. Растлумачыць кожнаму калгасьніку і аднаасобніку, што ў яго інтарэсах—датэрмінова выканаць план.

Кожны працоўны селянін павінен зразумець, што калгасны гандаль збожжам можа быць дазволен толькі пасьля выкананьня плянаў загатовак збожжа і ссыпкі насенных фондаў, што толькі тыя калгасьнікі і аднаасобнікі маюць права забіваць жывёлу і свабодна прадаваць мяса на рынку, якія акуратна выконваюць свае абавязкі перад дзяржавай.

Больш клясавай пільнасьці! Партарганізацыя БССР павінна зрабіць неабходныя урокі са справы былога сакратара Жлобінскага РК Жыракова, які страціў свой партыйны твар, зрадніўся і зрослся з клясавым ворагам.

Толькі бязьлітасная барацьба з рэшткамі кулацтва, вытрашчэньне з партыі апартуністаў, сабатажнікаў, патураючых клясаваму ворагу, забясьпечыць датэрміновае выкананьне плянаў і баявую падрыхтоўку да чацьвертай большавіцкай вясны.

0,8 проц. гадавога пляну дала апошняя пяцідзённка

Гэта вынік апартуністычнай бязьдзейнасьці і дэмабілізацыйных настроеў на фронце збожжазагатовак у радзе раёнаў

Мабілізаваць усе сілы і сродкі для завяршэньня збожжазагатовак да 25 сьнежня

Тэмпы збожжазагатовак па БССР

(у процантах да гадавога пляну)

Здана на 5 сьнежня

Калгасы МТС	Інш. калгасы	Аднаасобнікі	Усяго загатоўлена	Разам з насеннымі
102,5	75,8	58,9	65,9	59,4

Здана на 10 сьнежня

Калгасы МТС	Інш. калгасы	Аднаасобнікі	Усяго загатоўлена	Разам з насеннымі
103,4	76,3	59,9	66,7	60,2

Бацуньская ячэйка ўзначаліла барацьбу за збожжа

УВАРАВІЧЫ (НАШ КАР.). БАЦУНЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ ПАВІНЕН У ГЭТЫМ ГОДЗЕ ЗДАЦЬ 213 ЦЭНТН. ЗБОЖЖА (РАЗАМ З КАЛГАСАМ «ЧЫРВОНЫ ШЛЯХ»).

БАЦУНЬСКІЯ КАМУНІСТЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ ПЕРАМОГУ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ ГЭТАЙ ВАЖНЕЙШАЙ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ, СТАЎШЫ НА ЧАЛЕ БАРАЦЬБЫ ЗА ЗБОЖЖА.

РАЗГОРНУТАЯ МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ—АДНААСОБНІКАЎ, ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ПАСТАНОЎ ПАРТЫІ І ЎРАДУ АБ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ І КАЛГАСНЫМ ГАНДЛІ, У ПРЫВАТНАСЬЦІ АПОШНЯЙ ПАСТАНОВЫ АД 2 СЬНЕЖНЯ, ЗЬЯВІЛІСЯ МАГУТНАЙ ЗБРОЯЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

ТЭМПЫ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК НАРАСТАЛІ ШТОДЗЕННА. КАЛІ НА 25 ЛІСТАПАДА БЫЛО ЗДАНА 70,4 ПРОЦ., ДЫК НА 5 СЬНЕЖНЯ ЗАДАНЬНЕ БЫЛО ВЫКАНАНА НА 100,8 ПРОЦ. КОЖНЫ ДЗЕНЬ АПОШНЯЙ ДЭКАДЫ ДАВАЎ ПРЫРОСТ У 2,9 ПРОЦ.

БАЦУНЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ ПЕРШЫМ У РАЁНЕ ВЫКАНАЎ СВОЙ АБАВЯЗАК ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.

ЗАРАЗ БАЦУНЬСКАЯ ПАРТ'ЯЧЭЙКА І СЕЛЬСАВЕТ ПАСЬЛЯЮЦЬ БРЫГАДУ З ЛЕПШЫХ АКТЫВІСТАЎ У АДСТАЛЬЯ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ СЕЛЬСАВЕТЫ.

А. К.

Рэчыцкая партарганізацыя мабілізавана на завяршэньне загатовак

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). 10 сьнежня адкрыўся пленум РК КП(б)Б, на якім былі заслуханы даклады аб становішчы загатовак збожжа, ільну і мяса.

На 10 сьнежня Рэчыцкі раён выканаў плян збожжазагатовак разам з насеннымі на 39 проц. Па цьвёрдых заданьнях скасканага толькі 40 проц. На ільну з загатоўкамі мяса і ільнавалакна.

Пасьля даклада прадстаўнікоў загатоўчых арганізацый выступілі сакратары вясковых парт'ячэек, якія характарызавалі работу на мясцох.

Сакратар парт'ячэек Маладускага сельсавету—**Сьвярдлоў** і Васілевіцкага — **Флеер**, жадаючы прыкрыць сваю бязьдзейнасьць «аб'ектыўнымі» прычынамі, выступілі на пленуме з яўна апартуністычнымі прамовамі. Сьвярдлоў скардзіўся пленуму на тое, што раённыя арганізацыі «ня хочуць яму дапамагаць, ня гледзячы па яго неаднаразовыя просьбы, ня хочуць выслаць суд у яго сельсавет».

Васілевіцкі сельсавет выканаў плян збожжазагатовак на аднаасобным сэктары па 19 проц., цьвёрдыя заданьні зусім не спаганяюцца.

Сакратар ячэйкі Флеер тлумачыць дрэннае становішча з загатоўкамі тым, што ён «вельмі заняты і ня можа сабраць партыйнага сходу, бо шмат часу адбіраюць несазагатоўкі». Пленум жорстка асудзіў ашыбленьне гэтых сакратароў, кваліфікуючы іх, як яўна апартуністычныя.

Пленум настаўляе **спыніць сваю работу да 25 сьнежня** з тым, каб рапартаваць ЦК КП(б)Б аб завяршэньні загатовак. Удзельнікі пленуму мабілізаваны для правядзеньня масавай работы на вёсцы. Пленум пастанавіў прыцягваць да суровай партыйнай адказнасьці тых, хто дэзэртуе з загатоўчага фронту.

«Рэчыцкая праўда» высылае вынязную рэдакцыю ў Горвальскі сельсавет, які адстае ў збожжазагатоўках.

Усяго ў сельсаветы выехала звыш 100 членаў партыі і 35 камсамольцаў.

Д.

На млын клясавага ворага

(Агляд лістоў карэспандэнтаў)

Па вузкай прасёлачнай дарозе рушыцца невялічкі абоз са збожжам і бульбай, усяго 6 фурманак. Прыпутыя ў дарожныя пляшчы дзядзькі часта азіраюцца назад, ці ня сочыць хто-нідзь за імі.

Асьцярожна ступаюць коні. Страх гапнароў лібо нарэшце і да іх.

Далёка з-за лесу засталася вёска. Цяпер яны адчуваюць сябе крыху вальней. Ва'ялая ўхмылка зьявілася на твары самага маладзейшага, як быццам ён хацеў абрадаваць усіх — як лёгка здалося ашукаць сельсавет.

Астатнія бацькі заняты больш сур'ёзнымі думкамі. Кожнаму марылася багатая выручка і, галоўнае, каб пасьпець да вечара вярнуцца дадому. Так яны і ня прыкмецілі, як пад'ехалі да самага гарадзкога базару.

На прыкмеце іх і сельскі савет. Вось што нам піша аб гэтым карэспандэнт з Клічава:

«Кулацкі заможнікі вёскі Ляднёва, Віркаўскага сельсавету: Каледзіч Базыль, Кузнацоў Б., Саўко Лекса, Дзядко Б., Адяхновіч Г. і Саўко Міхась не атрымалі цьвёрдага заданьня і разбазарваюць сваё збожжа і бульбу на базары ў Бабруйску. Яны адкрыта залуляюць, што «ў мінулым годзе мы ня выканалі сваё заданьне і ў гэтым не здадзім». Сельсавет і парт'ячэйка зусім упусьцілі іх з-пад увагі» (М. П-н.).

Ці выпадкова гэта зьявішча ў Клічаўскім раёне?

«Такіх прыкладаў, — піша карэспандэнт, — у раёне многа. Судовыя органы не арганізавалі ні аднаго паказальнага працэсу над кулацка-заможнымі гаспадарамі, якія злосна сабатуюць здачу збожжа».

Старшыня РВК тав. Грыбаедаў выдаў спэцыяльны загад «Усіку спаганьня цьвёрдых заданьняў» ня вёсьці, а злучыць гэта разам з другой аднаасобнікаў». Сакратар раённага камітэта «Загатобожжа» не дае правільных вказак».

На 5 сьнежня па цьвёрдых заданьнях спагнана ўсяго 26 проц. пляну. Клічаўскія кіраўнікі выпусьцілі кулака з поля зроку. Ніякай дыфэрэнцыацыі, ніякага ўліку. Так лепш чэй!

Ажасьць кіраўніцтва клічаўскіх арганізацый по забясьпечванне пасьпяховага выкананьня пляну збожжазагатовак. Гэта ўжо не ўпяршыню. І з адгрузкаю бульбы раён да канца кампаніі цягнуўся ў хвасьце.

Такое-ж зьявішча наглядаецца і ў Чэрвеньскім раёне:

«Заможнікі Шатэр Цімох, Розум Марка, ВАЛЕВАЧОЎСКАГА сельсавету, злосна ня выконваюць свае заданьні і вядуць шалёную агітацыю сярод аднаасобнікаў супроць збожжазагатовак. Сельсавет і парт'ячэйка спакойна назіраюць за дзейнасьцю клясавых ворагаў» (Ул. КАЗАЧОНАК).

Вось яшчэ больш яркі факт. Гэты-ж карэспандэнт піша:

«Члены Грабянецкага сельсавету — БУЛГАК, РУБЕНЧЫК і ЯСЬКЕВІЧ даюць сыстэматычна весткі ў сельсавет аб тым, што цьвёрдыя заданьні па іхняй вёсцы ўжо спагнаны, у той час, як заможнікі нават і ня думаюць выконваць іх. «Актывісты» да гэтага часу ня выведзены са складу сельсавету».

У паасобных мясцох кіраўніцтва сельсавету шчыльна зраслося з кулакамі і праводзіць іхнюю палітыку:

«Старшыня БУДАЎСКАГА сельсавету, Дубровенскага раёну, БАЎРЯКОЎ сыстэматычна п'янствуе разам з кулакамі і вызваляе іх ад цьвёрдых заданьняў. Сын кулака Міхальчанка Хведара атрымаў у сельсавеце ілжывыя спраўкі і паехаў вучыцца ў Масыву. Жонка гэтага-ж кулака спэкулюе вопраткай і абуткам. Кулацкія ўчынкі застаюцца беспакаранымі. Старшыня сельсавету ўжо цэлы месяц зусім не зьяўляецца на работу». (МІНАЕЎ К.).

Магчыма, Будакоўскі сельсавет знаходзіцца за сотні кілёмэтраў ад рабочага. Не, глыбока памыляецеся. Сельсавет тут-жа пад Масквой, [illegible] не хваробаюць палітычнай блізарукасьцю.

Вось яшчэ адзін прыклад:

«У склад прэзыдыуму Руднянскага сельсавету, Чэрвеньскага раёну, пралез кулацкі агент АВІЛА. Увесь час ён вядзе шкодніцкую работу, накіраваную на зрыў усіх мерапрыемстваў партыі і ўраду». У. К.).

Сельсавет церпіць дагэтуль у сваіх радох кулацкага агента.

«Старшыня Дарасінскага сельсавету, Слуцкага раёну, ПЯТРОВІЧ адкрыта кажа, што наш плян мы ніколі ня выканаем, бо ён нерэальны». (Я. ТРАЯНОЎСКІ).

Практычная работа Пятровіча наглядна паказвае твар тых, хто стаіць за яго сьпіной. Цьвёрдыя заданьні па гэтым сельсавеце спагнаны ўсяго на 48 проц.

«Члены Бараўскага сельсавету ГЛУХІ П. і ВАСІЛЕЎСКІ Я. (Меншчына) самі ня выканалі сваіх заданьняў. Німай работы на сваім вучастку яны не вядуць. Атрымаўшы ў сельсавеце абвесткі для раздачы аднасельчанам па мясазагатоўках, Глухі, напіўшыся п'яным, згубіў іх па дарозе. Прэзыдыум сельсавету вывеў іх са складу і перадаў справу ў суд». РЫЖАКОЎ).

Але чаму-ж сельсавет агледзоўся толькі цяпер? Трэба было ўжо даўно ачысьціцца ад кулацкіх элемэнтаў:

У Жлобінскім раёне парушылі збожжазагатоўкі праводзіць сваімі «ўласнымі, выпрабаванымі» мэтадамі. Замест разгортваньня масавай работы «сярод беднякоў і серадняко ў — аднаасобнікаў, замест мабілізацыі мясцовага актыву:

«кіраўнікі МЭРМАЛЬСКАГА сельсавету з санкцыі РВК судзілі 74 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі за невыканаўленьне самазабавязацельстваў, а потым рабілі вобыскі ў асуджаных і забралі збожжа». (Селькор БІЧ).

Усе ведалі ў раёне аб гэтых фактах, але ніякіх мер супроць «ляўацкага» адміністраваньня ня прымалі. Сакратар райкому Жыракоў быў заняты больш «важнай» справай — абаронай сваякоў-заможнікаў.

Не адстаюць ад сваіх пашлепнікаў і ў Клічаве:

«Усохкі сельсавет даводзіць плян [illegible] савету БЕРХЛАНІН і настаўнік ПЫЖ праводзяць сыстэматычныя вобыскі ў беднякоў і серадняко ў — аднаасобнікаў і нават у калгасьнікаў. Знайшоўшы ў іх збожжа — яны даюць ім заданьне». (М. П.).

Неабходная ўмова посьпеху збожжазагатовак — бязьлітасная барацьба з апартуністычным скажэньнем лініі партыі ў загатоўках.

Урад Зрыё падаў у адстаўку

ПАРЫЖ, 14. Палата дэпутатаў адхіліла 402 галасамі супроць 187 праект поты французкага ўраду Злучаным штатам, у якім ён даў згоду на плацёж па даўгох к 15 сьнежня з агаворкамі. У рэзультаце галасаваньня ўрад Эрыё, паставіўшы пытаньне аб давер'і, падаў у адстаўку. Урад быў скінут блёкам сацыялістаў, правых і цэнтру

Нарады французкага прэзыдэнта з палітычнымі дзеячамі

ПАРЫЖ, 14. «Гавас» паведамляе: Прэзыдэнт Лебрэн пачаў нарады з палітычнымі дзеячамі аб фармаваньні габінэту. Большасьць асоб, з якімі ён меў нарады, рэкамэндавала яму даручыць фармаваньне новага габінэту Эрыё, вытарытэт якога застаецца непарушным».

Водгукі кітайскай прэсы і грамадзтва на аднаўленьне савецка-кітайскіх дыплёматычных адносін

ШАНХАЙ, 13. Увесь кітайскі друк зьмячае паведамленьне агенцтва Рэйтэр з Жэнэвы аб аднаўленьні дыплёматычных адносін паміж Кітаем і Савецкім Саюзам. Паведамленьні паступілі позна ноччу і таму камэнтары адсутнічаюць. Учора ноччу і сёньня раніцою карэспандэнта ТАСС узмоцнена запытваюць па тэлефону рэдакцыі газэт, некаторых асоб і арганізацый аб падрабязнасьцях гэтых паведамленьняў, якія выклікаюць вялізарную зацікаўленасьць. Гэтым паведамленьнем ладаюць вялікае значэньне ў сувязі з расчараваньнем шырокіх колаў кітайскай грамадзкасьці рэзультатам работ Лігі нацый, выступленьнямі Саймона, а таксама ў сувязі з пытаньнем аб Гу Бінкуе, якое да гэтага часу ажыўлена абмяркоўваецца.

***

ШАНХАЙ, 13. Ва ўсіх колах кітайскага грамадзтва наглядаецца адкрытае задаваленьне і радасьць з прычыны аднаўленьня дыплёматычных адносін паміж Кітаем і СССР. Камэрцыйныя колы выказваюць надзею на ажыўленьне гандлёвых сувязяў з СССР. Розныя таварыствы вучоных, журналістаў і пісьменьнікаў заяўляюць аб неабходнасьці хутчэйшага ўстанаўленьня кантакту з навуковымі і грамадзкімі коламі Савецкага саюзу.

***

ШАНХАЙ, 13. Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што сочаканасьць аднаўленьня дыплёматычных адносін паміж СССР і Кітаем выдзявіла ўсе колы Нанкіну, якія аднадушна вітаюць гэты акт. Нанкінскія колы мяркуюць, што гэты акт будзе спатканы з захапленьнем шырокімі пластамі кітайскага народу, як вельмі мудры крок з боку нанкінскага ўраду, асабліва з прычыны таго, што ўсмацняецца пераканаўленьне кітайскага народу ў тым, што ён павінен спадзявацца толькі на самога сябе, а не на Лігу нацый у справе вырашэньня японска-кітайскага канфлікту па манчжурскім пытаньні. Паводле слоў агенцтва Рэйтэр, аднаўленьне дыплёматычных адносін паміж СССР і Кітаем разглядаецца ў Нанкіне, як факт, які адкрывае новую эру ў дыплёматычнай гісторыі Кітаю.

Новы прысуд кары сьмерцю над салдатамі

ВАРШАВА. Гэтымі днямі ў Львове адбыўся ваенна-палявы суд над **Шкуркоўскім** Віктарам (капрал рэзэрву 6-га лётнага палку), **Вэрнэрам** Людвігам (радыётэхнік) і **Ланцутам** Максімільянам.

Усе трое абвінавачваюцца ў «шпіянажы». Ваенна-палявы суд прыгаварыў: **Вэрнэра да кары сьмерцю праз павешаньне. Шкуркоўскага — да бестэрміновай катаргі і Ланцута — да 15 год катаргі.**

Абаронца Вэрнэра зьвярнуўся да прэзыдэнта рэспублікі з просьбай аб памілаваньні. Прэзыдэнт замяніў Вэрнэру кару сьмерцю на бестэрміновую катаргу.

З БАЛЬШАВІЦКАЙ НАСТОЛІВАСЬЦЮ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ПАСТАНОВЫ СЬНЕЖАНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б

Тав. ШАРАНГОВІЧ У ВІЦЕБСКУ

ВІЦЕБСК. (Ад наш. спец. кар.).

13 сьнежня адбыўся гарадзкі сход партактыву.

З дакладам аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б выступіў сакратар ЦК тав. ШАРАНГОВІЧ.

У прынятай рэзалюцыі сход аднадушна ўхваліў пастановы пленуму.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Партактыў Бабруйску ўхваліў пастанову пленуму ЦК КП(б)Б і ЦКК КП(б)Б

БАБРУЙСК. 12-га лістапада адбыўся сход партактыву г. Бабруйску сумесна з партактывам гарпісоду. Сход заслухаў даклад старшыні ЦКК КП(б)Б тав. Лычова аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б і лістападаўскага пленуму ЦКК КП(б)Б. Сход ухваліў пастановы пленуму і цалкам далучыўся да іх.

У мэтах ажыцьцяўленьня пастаноў пленуму аб барацьбе за ўзмацьненьне ўраджайнасьці, актыў абавязаўся давесьці плян веснавой сяўбы (за кожнага калгасу і саўгасу не пазьней 1 студзеня, арганізаваць поўную ссыпку насенных фондаў да 15 студзеня, забясьпечыць ўласным насеннем калгасы, саўгасы і аднаасобнікаў, для чаго абвешчан з 15 сьнежня па 15 студзеня месячнік ачысткі насеньня. Выпусьціць пратанова скончыць рамонт інвэнтару да 10 красавіка.

Вялікую ўвагу сход аддаў пытаньню разьмеркаваньня даходаў калгасьнікаў.

Сход актыву абязаўся сябе мабілізаваным на выкананьне пляну збожжазагатовак і 90 проц. пляну ільназагатовак да 20 сьнежня, пастанавіўшы накіраваць на вёску дадаткова 50 раённых працаўнікоў.

Рад практычных мерапрыемстваў прыняты сходам па выкананьні пастаноў пленуму аб рэвалюцыйнай законнасьці, калгасным гандлі і перабудове работы школ.

Сход адобрыў пастанову ЦК аб зьняцьці з работы сакратара Жлобінскага райкому і перадачы справы ў ЦКК аб яго партыйнай асьці. Па пытаньні партмасавай работы сход вызначыў канкрэтныя лічбы ахопу партвучобай камуністаў і актыву і паставіў зада 100 процантнага ахопу кандыдатаў партыі партвучобай. Сход завастрыў увагу партактыву на ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі.

(БЕЛТА).

Баявая праграма

10 сьнежня адбыўся сход гомельскага партыйнага актыву, які заслухаў даклад сакратара гаркому тав. Шафарэнкі аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі актыў ухваліў пастанову пленуму і вызначыў мерапрыемствы для іх ажыцьцяўленьня.

Асабліва выпушчана задача барацьбы за ўраджайнасьць. «Партактыў падкрэсьлівае, што веснавая сяўба і барацьба за ўраджайнасьць зьяўляюцца цэнтральнай задачай, на ажыцьцяўленьне якой трэба мабілізаваць увагу і сілы ўсёй гомельскай партыйнай арганізацыі».

Актыў падкрэсьліў, што Гомельскі раён адстае з выкананьнем пляну загатовак і што прычына гэтага зьяўляецца слабая масавая работа вакол гэтай важнейшай кампаніі. Прымаючы на сябе абавязкі для найхутчэйшага скажэньня пляну загатовак, актыў адзначыў неабходнасьць больш моцнага націску на кулацка-заможную частку, рашучага перамаганьня супраціўленьня кулака.

На фронце культурнага будаўніцтва Гомельшчына, як і ўся БССР, мае вялікія дасягненьні. Але ёсьць яшчэ рад буйнейшых недахопаў у культурна-цацыянальным будаўніцтве. Слаба праводзіцца беларусізацыя, вывучэньне культуры. Школы, тэхнікумы, інстытуты яшчэ перабудаваді поўнасьцю сваёй работы ад паведна дырэктывам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

За выкананьне гэтых недахопаў, на выкананьне ўсіх плянаў актыў заклікаў ўсю гомельскую партыйную арганізацыю, на прыкладу бальшавікоў Маскоўскай вобласьці, у найкарацейшы тэрмін выканаць пляны загатовак і па-бальшавіцку ўзяцца за рэалізацыю ўсіх пастаноў апошняга пленуму ЦК КП(б)Б.

Рашэньні пленуму «зьяўляюцца прыкладам бальшавіцкага канкрэтнага кіраўніцтва з боку ЦК КП(б)Б, — [illegible] рэзалюцыі — і забясьпечваюць далейшае [illegible] ховае сацыялістычнае будаўніцтва [illegible]

Мабілізаваліся на выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу ад нашага спэцкора).

9-10 сьнежня адбыўся пашыраны пленум райкому КП(б)Б з удзелам сакратароў ячэек, камуністаў-дырэктароў саўгасаў і старшынь сельсветаў.

Пленум адназгодна ўхваліў пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б і вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па давядзеньні іх да шырокіх партыйных і беспартыйных мас, і баявой рэалізацыі.

Пленум абязаўся сябе мабілізаваным на выкананьне пляну ўсіх відаў загатовак і мабілізацыі сродкаў і на пасьпяховае завяршэньне чацьвертага заключнага году пяцігодкі.

Пленум зацьвердзіў пастанову бюро райкому аб выключэньні з партыі трох дэзэртыраў загатоўчага фронту—Гольдзіна, Матліка і Фроміна.

Удзельнікі пленуму выехалі ў сельсаветы для правядзеньня загатовак і мабілізацыі сродкаў.

ГАЛКІН, ПАРОШЫН.

50-ГОДЗЬДЗЕ НАРОДНАГА ПАЭТА ЯКУБА КОЛАСА

З ПОВАДУ МАЙГО ЮБІЛЕЮ

У жніўні 1906 году ў горадзе Менску па Пацгорнай вуліцы — цяпер вуліца Карла Маркса — у доме № 56, каля ня хіба ж ная памяць, адбываўся тайны сход прадстаўнікоў розных рэвалюцыйных арганізацый. Між іншым, на сходзе абмяркоўвалася пытаньне аб тым, якія спосабы трэба прымяніць найболей мэтазгодныя, каб весьці рэвалюцыйную прапаганду сярод шырокіх пластоў працоўнага люду. Былі тут прадстаўнікі і ад віленскага настаўніцтва. На гэтым сходзе сустракаўся я з Уласовым, потым рэдактарам «Нашай нівы» і ад яго давядаўся, што ў Вільні праектуецца выданьне газэты на беларускай мове. У той час сярод віленскага настаўніцтва і розных груп дробнай інтэлігенцыі я быў трохі вядом, як беларускі паэт. Мае вершы розных зместу хапалі спытам у рукапісах. Аказалася, што Уласоў шукаў мяне, каб залучыць у супрацоўнікі беларускай часопісі. Я быў дужа ўсьцешаны, давядаўшыся аб нарадженьні ў бліскай будучыне беларускай газэты і з радасьцю даў згоду прымаць удзел у выданьні газэты. Выступаць-жа ў беларускай газэце пад сваім прозвішчам тады была рызыкоўная справа. Царская палітыка ў дачыненьні да народаў, уваходзіўшых у склад Расійскай імпэрыі, не дапускала ніякіх праяўленьняў для іх нацыянальна-культурнага адраджэньня. Настаўнікам-жа цярэмарна забаранялася ня толькі прымаць удзел у справе фармаваньня культуры свайго народу, але і пісаць у газэтах больш-менш ліберальнага кірунку. Бяз рызыкі можна-б было пісьмаць допісы толькі ў органы выразна чорнасоценнага друку.

Вось тут, на гэтым сходзе і пераробіў я сваё імя на Якуба Коласа, з якім і выступіў у беларускай літаратуры.

Я прыгадаў гэты факт цяпер, праз дваццаць шэсьць гадоў, у сувязі з маім пяцідзесяцігадовым юбілеем. Прыгадаў я яго для таго, каб пераўтварыць мінулае з готым, што робіцца і робіцца цяпер партыяй бальшавікоў і савецкай уладай у справе ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Калі-б дваццаць шэсьць гадоў таму назад, на тым-жа самым сходзе, мае вочы якімі-небудзь чынам убачылі ўсё тое, што здабыта нацыянальнымі культурамі народаў СССР і, у прыватнасьці, беларускаю ў абсягу культурна-нацыянальнага будаўніцтва пад сьцягам камуністычнай партыі і савецкай улады, я не паверыў-бы і прыняў-бы гэта за сон, за фантастычную казку. І сапраўды, калі гаварыць аб Савецкай Беларусі, прымушаны пад увагу той факт, што савецкая ўлада, заставаючыся тут усяго толькі дваццаць гадоў таму назад, то ўсё здабытае за гэты час на фронце культуры праставіцца, як дзівосная казка. Беларуская Акадэмія Навук, дзе канцэнтруецца чарнавая мысьль тавары взрыгтат, куды вопыты шумным патокам сьцякаюцца тысячы нашай працоўнай моладзі; Дзяржаўная бібліятэка, дзе сабрана больш мільёна кніг; дзесяткі вышэйшых навучальных устаноў, сотні середніх, тэхнікумы розных спэцыяльнасьцей, павуково-дасьледчыя ўстановы, дзесяткі тысяч пачатковых школ, дзе гучыць беларуская мова, дзе фармуецца новы чалавек—хіба ўсё гэта не нагадвае казку? І як мары, як нікчэмны ўсе натугі майстроў з фашысцкага лягеру, каб захаваць нацыянальную палітыку савецкай улады!

Дваццаць шэсьць гадоў таму назад беларуская літаратура была прадстаўлена ўсяго пекалькімі імёнамі, і даволі пальцаў адной рукі, каб іх пералічыць. Па цёмных кутках, хаваючыся за свае псэўдонімы, рыхтуючы сваімі мізэрнымі пасадамі, ня маючы ніякай матар'яльнай карысьці, пісалі беларускія пісьменьнікі. Калі-ж зьвярнуцца да савецкай рэчаіснасьці і паглядзець на становішча беларускай літаратуры на сёньняшні дзень, то польга ня дзівіцца яе вялікаму росту за гэты час. Сотні новых пісьменьнікаў імёнамі дзесяткі выдатных талентаў узгадаваліся на яе гонях. Чым тлумачыцца гэты факт? Перш за ўсё, тымі спрыяючымі ўмовамі, якія дае савецкая ўлада пісьменьніку. Можна сьмела сказаць, што нідзе на сьвеце ня даны пісьменьніку такія мажлівасьці для яго творчага росту, як у Савецкім саюзе, і вялікая іншая рэчаіснасьць не дае яму такога жывога, цікавага, багатага матар'ялу, які дае яму рэчаіснасьць савецкая. І другая важная абставінасьць. Кастрычніцкая рэвалюцыя, зьнішчыўшы аковы рабства, вывела з нетраў працоўных мас яе творчыя сілы й дала шырокі прастор для іх выяўленьня.

Надзвычайнае разьвіцьцё вышэйшых навуковых і навучальных устаноў, пачуванае капкрэпьне граматнасьці, называлы рост літаратуры і мастацтва — вось вузлавыя пункты здабыткаў нацыянальнага ленінскага культурнага будаўніцтва, якое зусім прымушае кожны, хто мае вочы, каб бачыць.

Не фашыкам, не буржуазны ліберадам нацыянал-дэмакратызму, а толькі дыктатура пралетарыяту пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі забясьпечвае нашым іх культурны рост і росквіт.

Калі прадстаўлялі сабе малюнак культурнага будаўніцтва ў межах Савецкай Беларусі і яго здабыткі, то мімаволі прыходзіць на памяць і Беларусь пад польскай акупацыяй. І польга думаць аб Заходняй Беларусі без таго, каб не прыгадаць бесперасьветных часоў царскага гнёту эпохі Сталыпінчыны з яе васпка-палянскай суцэмі, расстрэламі, пыбенітамі. Мімаволі ў памяці ўстаю азьвярэлы цёмк сацыяльнай культуры, часы зьдзеку і гвалту і жандарска-паліцэйскага рэжыму. Калі даўней, за царом, на месцы Беларусі, была «Западная окраина», то цяпер на месцы Заходняй Беларусі стаў «ўсходняя прэсы». Калі за царом груба тапталася, высьмейвалася і выгнаялася са школ беларуская мова, то цяпер у дапатак ня ўсяго гэтага там накладаюцца штрафы за ўжываньне язэпнымі ў школе свайго матчынага слова. Тым-ж пазбавіся культурных установы, што былі выкліканы да жыцьця ў [illegible] рэвалюцыйных [illegible] цяпер [illegible] відаваны поўнасьцю. Усе вопытчы беларускага культурнага жыцьця загнаны нацыяналістамі «культурнай», «дэмакратычнай» панскай Польшчы. Разгромлена Гімназія-ліцэй беларускай школы. Лепшыя сыны працоўнага беларускага народу разагнаны, зацісьнуты ў нашольле або пасаджаны ў астрогі. Як і ў царскія часы там пырока практыкуюцца тым-ж самым кошмы жандараў у дачыненьні да «крамолнікаў», што ахоўвалі сваё жыцьцё за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне працоўных.

Тым-ж царскія астрогі і на сёньняшні дзень злучаюцца там гальфамі і крыжамі дарогі, якімі ідуць мучэнікі за справу працоўнага народу.

У дні, калі тут пыроках савецкая грамадзкасьць, пісьменьніцкія кампаніцы, рабочыя нашай рэспублікі адзначаць сваё пяцідзесяцігодзьдзе і аказваць мае высокі гонар, то там, у акупаванай Беларусі, судзяць яе лепшага з лепшых сыноў, Бронеслава Тарашкевіча, замучанага, абнявольванага цяжкою няволі польскіх астрогаў.

Прыемнымі маты панскай юстыцыі, пыйныя балічкі на цяле працоўнага народу, у хаўрусе з прадаватарамі, з дэфаміцыі махінарамі, з кулакамі за панскія сребраникі, сьведкамі, уже робяць судовую кампанію і ўносяць карэктывы да роляў, утрацілых чалавечае аблічча камэдыянтаў. Стрымайце вашы брудныя крывавыя рукі, прыслужнікі Баала! Закрыйце гнойнікі вашага словаблудзтва, інтэрвенцыянісцкія майстры! Каго судзіце і вядзеце на Галгофу?

Як хутка забыліся вы, «культурная» панская Польшча, аб сваёй няволі пад абсцам панскага бота!

Уступаючы ў другую палову свайго веку, я горача пратэстую супраць класавай і нацыянальнай расправы над беларускім народам Заходняй Беларусі і яе верным дзецьмі. Нехай высока ўзьвіецца наш чырвоны сьцяг Саветаў!

ВІТАЕМ ЯКУБА КОЛАСА

Арганізацыйны Камітэт Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР ад імя ўсёй літаратурнай грамадзкасьці БССР перадае вам гарачае прывітаньне.

З вашага пяцідзесяцігадовага жыцьцёвага шляху дваццаць сем год прыпадае на літаратурна-мастацкую творчую дзейнасьць. [illegible] тых крызісаў змагароў першай рэвалюцыі нівах і гарадзкіх бруку спраўнай дзікае ігрышча, вы мецна гукалі «ХЛАПЦЫ, СТРЭЛЬБЫ БЯРЫ». Сваёй творчасьцю вы клікалі сялянскія масы на барацьбу з самаўладзтвам, з паміншчыкам.

Нацыяналістычныя настрої, якія выявіліся ў пасобных вашых творах, на пасобных этапах вашай літаратурнай дзейнасьці, ідэёвыя хістаньні перамагаюцца вамі ў вашай сучаснай літаратурнай дзейнасьці.

Цяпер, калі рабочыя і сяляне, якія пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі прагналі паменшчыкаў і капіталістаў, на шырокіх прасторах Беларусі будуюць сацыялістычныя [illegible] кляса экспляататараў—кулацтва, калі перамагаюцца традыцыі, прывычкі, інстынкты ўласьніцтва, так па-майстарску вамі паказаныя ў «Новай зямлі» — літаратурная грамадзкасьць спадзяецца, што вы сваёй творчасьцю будзеце ў першых радах змагароў за зьнішчэньне ўласьніцкіх традыцый, за бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

Арганізацыйны Камітэт ССП БССР.

ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Граніц нітка шаленству катаў —
— Душы, даві...
— Крыві. Крыві... —
Вось голас панскіх дэмакратаў.
Лютуе кат. Растуць магілы,
А на магілах — бур'яны...
Краіны верныя сыны.
Клюе вас «осколъ» беларускіх.
Працяты жаласьцю астрогі,
Абліты кроўю іх журы...
Хвала вам, вогатары —
Не зарастуць вашы пароги.
Вас судзіць суд продажнай зграі,
Дзе панскі зброд,
Сумленьне пінуўшы за плот,
На «Кросах» «цуды» выгварае.

А на тых «Кросах» стоіць пакуты,
Гібее, чэзьне там народ —
Нацыянал-фашысцкі бот
Ступае помсьліва і люта...
О Беларусь у польскіх межах
Цябе расьвіты на крыжы,
І смокчуць мозг твой вужы,
І дзеліць кат тваё адзеньне.
Але ўсяму ёсьць свая мера:
Надыдзе пяўнікнёны час,
І будзе суд загнаных мас —
Аплату ён нясе вам, зьверы.

ЯКУБ КОЛАС.

16-XI — 1932.

ПРЫВІТАНЬНЕ АД АКАДЭМІІ НАВУК

Беларуская Акадэмія Навук горача вітае нараднага паэту—АКАДЭМІКА ЯКУБА КОЛАСА, упісаўшага яркую старонку ў гісторыю беларускай літаратуры.

50-годзьдзе т. Я. Коласа, якое супадае з росквітам яго творчых сіл,—заруна далейшага актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Мы ўпэўнены, што вострае мастацкае пяро Я. Коласа будзе бязьлітасна выпрываць ворагаў пралетарыяту, выкрываць дробна-ўласьніцкія інстынкты, нявухіль на заклікаць масы да выкананьня тых вялікіх задач пралетарыяту, якія стаяць перад ім у барацьбе за індустрыялізацыю і калектывізацыю, стоіць весьці барацьбу за беларускую сацыялістычную культуру.

15 год дыктатуры пралетарыяту заблісьнечыя бурны росквіт творчасьці тав. Я. Коласа. Праўда, на пасобных этапах цяжкага шляху яго творчасьці, у душу паэты часамі ўрываліся хістаньні, але ёй заўсёды знаходзіў сілы іх пераламаць, каб далёка заклікаць масы на далейшую барацьбу за сацыялізм.

У шчыльных радах пралетарыяту, які дабіўся пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі нячуваных у гісторыі посьпехаў, заруна новых вялізарных посьпехаў дарагога нам тав. Якуба Коласа.

Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук
П. ГОРЫН.

Паважаны Кастусь Міхайлавіч

Народны Камісарыят Асьветы БССР шле вам гарачае прывітаньне ў сувязі з пяцідзесяцігодзьдзем з дня вашага нараджэньня.

Мы ўпэўнены, што вы яшчэ з большай актыўнасьцю і энэргіяй доўгія гады будзеце працаваць на фронце будаўніцтва сацыялістычнай культуры.

Нарадны камісар асьветы ПЛАТУН.

ЯКУБУ КОЛАСУ

Як калісь сынавай
Аб горы, няволі,
Так сынаваць ня будзем
Болей ужо ніколі.
Адно, брат, падумаць,
Адно падзівіцца,
Як жыцьцё пабегла
Жвавасю крыніцай:
Бальшавік дасужы
Гаспадарку творыць,
А так, дружа, удала,
Што ня будзе горо.
Во — зірні — сярмяжнік
Паганяе трактар,
Пасекі карчуе,
Межы рэжа ўпарта.
Фабрыкі, заводы, —
Коміны пад неба...
Шмат чаго мы робім,
А яшчэ болей трэба.
За час доўгі—доўгі —
За ўсё паўстагодзьдзе —
Шмат зрабіў ты, браце,

Ды яшчэ ня годзе.
Перад намі, Колас,
Сьветлы шлях адкрыты...
На нівах красуе
Ядрэнае жыта.
Час перажываем
Казачна-цудоўны...
Давай-жа пець песьні
З усёй грудзі поўнай.
З думкаю — наперад.
З думкай бунтаўнічай —
Туды — усё далей,
Куды жыцьцё кліча.
Хай [illegible]
Радасьцю жывою,
Як тут у Саюзе,
Тай і [illegible]
Жыві, мілы Колас,
Многа летаў, зімаў
З ясным сонцам шобач
На зямлі радзімай.

Янка Купала.

Менск, 11/XII-32 г.

В. БАРЫСЕНКА

ТВОРЧЫ ШЛЯХ ЯКУБА КОЛАСА

I.

Сёньня пралетарская і савецкая грамадзкасьць БССР адзначае 50-гадовы юбілей з дня нараджэньня вялікага мастака слова, народнага беларускага паэты Якуба Коласа.

Большую палову свайго пройдзенага жыцьцёвага шляху Колас прысьвяціў літаратурна - мастацкай дзейнасьці. Дваццаць шэсьць год таму назад Колас выступае на літаратурную арэну з першымі сваімі творамі. Творчы шлях Я. Коласа, пройдзены паэтам за 26 год сваёй літаратурна-творчай дзейнасьці, вызначаецца вялікай складанасьцю і багатай розностайнасьцю.

Выявіць і паказаць, якую клясавую пазыцыю займаў пісьменьнік на тых ці іншых этапах клясавага змаганьня можна толькі тады, калі мы ацэнку творчасьці Коласа будзем даваць з пункту гледжаньня характару і рухавых сіл рэвалюцыі на Беларусі, з пункту гледжаньня тых задач, якія сталі перад пралетарыятам на кожным канкрэтным этапе барацьбы.

У творчасьці Коласа раньняга перыяду ня толькі знайшло сваё яркае адлюстраваньне бяспраўе, гаротнае становішча беларускага селяніна, у ёй з усёй выпукласьцю і паўнатой выліўся пратэст асноўных мас беларускага сялянства супроць дзікага сацыяльнага і нацыянальнага ўціску. У паэзіі Коласа знайшлі сваё яркае выяўленьне клясавыя імкненьні і ідэалы беларускага сялянства, з якімі яно ішло ў рэвалюцыю 1905 году.

Коласаўская творчасьць перыяду рэвалюцыі 1905 году пазнаражавана вырашэньню надзённых задач буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. У такіх сваіх творах, як «Вораганам», «Мікалай II», «Малебен» і цэлым радзе іншых, Колас рашуча выступае супроць самадзяржаўнага ладу і [illegible] манархіі. На гэтым этапе Колас дае нам творы, у якіх з незвычайнай сілай мастацкага таленту ўскрывае клясавыя карэньні нядолі беларускага селяніна, паказвае клясовыя супярэчнасьці і варонную непрымірымасьць нітарэзаў пана і селяніна, зрывае маскі з папоў «дабрадзеяў» і «абаронных» народу — «пара бапошкі», выкрывае мінёную, мінурную «мягутнасьць» расійскага царызму, паказвае клясавую эксплёатацыю сутнасьць папоў і самаўладзтва.

[illegible] вершы «Вораганам» Колас ад імя прыгнечанага сялянства зьвяртаецца і прадаўжае клясавы рахунак:

Багачы і панства
Нашы «дабрадзеі»,
Мы на суд вас клічам,
Каты вы, зладзеі!

І далей у гэтым-жа вершы выкладаюцца, па сутнасьці, праграмныя патрабаваньні рэвалюцыйнага сялянства. Колас заклікае селяніна на жорсткую клясавую барацьбу супроць царызму і абшарніцтва, кліча да рэвалюцыі і верыць у яе перамогу.

23. Дасягнутыя посьпехі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў адчуваюцца ў тым, што па радзе раёнаў ёсьць прыкмы бядняка-серадняцкіх мас вёскі ў калгасы. Партыйныя, савецкія і зямельныя арганізацыі павінны разгарнуць масавую работу па мобілізацыі бядняка-серадняцкіх мас вёскі на посьпехаў калгаснай вытворчасьці, аб пасьпяховай пробыцьці калгаснікаў і далейшых задачах калгаснага будаўніцтва.

(Працяг гледзі на 4 стар.)

ба Коласа зпохі рэакцыі, неабходна канстатаваць, што ў ёй выяўляецца хісткасьць пісьменьніка паміж буржуазнай і працоўнымі масамі, у ёй выяўляецца ўплыў на Коласа нацыянал-лібералісцкай ідэалёгіі нашаніўства. Сапраўды рэвалюцыйныя, глыбока дэмакратычныя творы Коласа гэтага пэрыяду, якія падымаюць яго на вышыню народнага паэты, не характарызуюць сабою творчасьць пісьменьніка на даным этапе.

III.

Дробна-буржуазная дэмакратыя ва ўстаноўленьні дыктатуры пралетарыяту ўбачыла парушэньне ўсякай дэмакратыі, праяўленьне ўладу над народам. Колас, знаходзячыся доўгія гады пад моцным уплывам буржуазнай ідэалёгіі, ня мог так хутка зрасьнець і ўсьвядомець сутнасьць Кастрычніка, стаў у супярэчнасьць з сацыялістычнай рэвалюцыяй. Гэта выявілася ў такіх вершах, як «Родныя малюнкі» і напісаным пасьля заключэньня рыскага міру «Беларускаму люду».

Побач з вершамі гэтага часу, у якіх ярка выяўлены буржуазны нацыяналізм, мы маем і такія, як «Цені-страхі», «Звон шыбаў» і інш., дзе паказана з усёй выпукласьцю замаскаваньне дробнага буржуа, які не зразумеўшы сутнасьці Кастрычніка ўяўляе ўсё вакольнае, як нешта палахлівае, страшнае і варожае.

Рабочая клясa ўсяго Савецкага саюзу і працоўныя масы сялянства, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, гераічнай перамогай закончыўшы барацьбу супроць імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі і ўнутранай контр-рэвалюцыі, прыступілі да адбудовы разбуранай народнай гаспадаркі на новых сацыялістычных пачатках. Творчасьць Коласа апяўленчага пэрыяду характарызуецца карэнным эрухам у бок пералягу сваіх рацыённых ідэалёгічных установак, на шлях перамаганьня сваіх нацыяналістычных памылак і перабудовы сваёй творчасьці ў напрэчку набліжэньня да актуальных тэм нашай сучаснасьці. Праўда, і ў гэты час у паасобных творах Коласа былі праяўленьні рэакцыйнай ідэалёгіі адваротнасьцю, раставарскай ідэалёгіі нацыянал-дэмакратызму.

У такім НЭПу выходзіць у сьвет коласава паэма «Новая зямля». Вялікая сіла і прарэчыстасьць бажі гэтага твору — у ярка выяўленай пераважнасьці супроць самаўладзьтва, у высока мастацкім пакаве непрымірымасьці нітарэсаў паміж кулацтвам і працоўнага сялянства, у голасным пратэсьце Коласа супроць барбарскай эксплуатацыі селяніна. Рэакцыйныя бакі «Новай зямлі» ў спаўзяньні пісьменьніка з рэвалюцыйных пазыцый на шлях стаўмаўскага рафармізму. Тут праяўляецца мажная капіталістычная гасьцінарка, як сродак вызваленьня селяніна ад усякага ўціску і насіляцтацыі.

Усе гэтыя рэакцыйныя моманты ёсьць ня што іншае, як праяўленьне ў даным творы нацыянал-лібералісцкай ідэалёгіі нашаніўцаў.

У аповесьці «У палескай глушы» ў цэнтры ўвагі стаіць пытаньне культурна-нацыяналізнага адраджэньня краіны. Колас у «Палескай глушы» і «У глушы Палесьсі» становіцца асабліва вялікім мастаком там, дзе ён уьвымае свой гучны голас рэвалюцыянэра-дэмакрата ў абарону правоў прыгнечаных народаў, дзе ён пратэстуе супроць «цёмнай ночы» няволі, што зьвісла над краем», дзе ён выступае супроць чорнасоценна-русыфікатарскай палітыкі царызму, дзе ім у глыбока сатырычных тонах намалявана самазадаволенае жыцьцё мешчаніна-абываталя, дзе зрываецца чорная раса з прадстаўнікоў духоўнага культу і паказваюцца яны як палізэйскія шпікі. Там-жа, дзе Колас паказвае шляхі і сродкі вызваленьня краіны ва ўмовах царызму з нацыянальнай няволі, там ён становіцца на пазыцыю нашаніўскага адраджэньня. Праўда, Колас сам расчароўваецца ў шляхох і сродках адраджэньня краіны шляхам культурніцтва і ўжо ў другой частцы гэтай аповесьці ўзьнімаецца да ўсьведамленьня таго, што клясавая барацьба працоўнага сялянства супроць памешчыкаў і самаўладзьтва зьяўляецца адзіным рэальным выхадам са становішча сацыяльнай і нацыянальнай прыгнечанасьці.

Але ў разуменьні характару і рухаючых сіл рэвалюцыі 1905 г. ён змыкаецца з нацыянал-дэмакратамі.

У «Сымоне музыку», дзе містыфікуецца, пачаецца ў адцяненутых сымбалічных вобразах татачасная даревалюцыйная рэчаіснасьць, Колас усё-ж акцыўна пратэстуе супроць сацыяльнай няроўнасьці, паказвае вясковага пралетара, як сілу, якая павінна абваліць сьвет.

Але ня толькі гэтымі творамі характарызуецца творчасьць Коласа адбуджэчага пэрыяду. Лепшае вырашэньне нацыянальнага дытаньня, умацаваньне дыктатуры пралетарыяту, рост гаспадарчага і культурнага буйніцтва абвяшчалі рашучы паварот Якуба Коласа ў бок савецкай улады.

У абоймку твораў «На рубяжы» Колас паказвае гераізм Чырвонай армії ў барацьбе супроць навалы белых банд, ён дае вобраз клясава-вытрыманага чырвонаармейца, камуніста і г. д. Паказваючы ў сваіх творах вёску, а

Аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб павышэньні ўраджайнасьці, аб пляне і арганізацыі веснавой сяўбы ў 1933 г.

Пастанова пленуму ЦК КП(б)Б па справаздачнаму дакладу Наркамзему БССР

24. Барацьба за павышэньне ўраджайнасьці, правядзеньне падрыхтоўкі і выкананьне пляну веснавой сяўбы павінна абавязкова суправаджацца шырокай масавай палітычнай работай сярод беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў, якія займаюць як у агульнай колькасьці, так і ў пляне сяўбы значнае месца.

Пленум папярэджвае ўсе партыйныя, савецкія і земельныя органы і абавязвае весьці барацьбу з недаацэнкай аднаасобнага сэктару. Практычнымі мерапрыемствамі ў гэтай галіне павінны быць: поўнае выкананьне пляну сяўбы і мабілізацыі ўсіх наявных рэсурсаў, аканьне аднаасобнікам агратэхдапамогі (ачыстка, пратручваньне, радавы пасеў і інш.), арганізацыя рамонту і снабжэньне інвэнтаром; барацьба за пасеў аднаасобнікамі ва ўстаноўленыя тэрміны; давядзеньне цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак і рашучая барацьба з сабатажам сяўбы кулацкімі элемэнтамі.

Стварыць у аднаасобных сэктарах страхавыя фонды ў разьмеры ад 7 да 10 проц. ад насеньфонду. Для ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыемства неабходна практыкаваць выбары ў кожным сельсавеце камісій садзейнасьці стварэньню страхавых фондаў.

***

25. Пленум прызнае работу партыйных, прафсаюзных і кааперацыйных арганізацый па павышэньні ўраджайнасьці ў прыгарадных гаспадарках — нездавальняючай.

Пленум даручае СНК спэцыяльна распрацаваць пытаньне аб рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прыгараднай зоны з тым, каб дабіцца ўжо ў 1933-34 г. г. забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў гародніной і бульбай за кошт гэтых зон.

Абавязаць гарадзкія і раённыя камітэты партыі аддаваць значна больш увагі пытаньням кіраўніцтва і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прыгарадных зон.

26. Пленум ЦК КП(б)Б абавязвае цэнтральны і раённы друк сапраўды па-бальшавіцку мабілізаваць шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС, калгаснікаў, беднякоў, сераднякоў—аднаасобнікаў на барацьбу за павышэньне ўраджайнасьці, падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. У барацьбе за гэтыя задачы друк павінен правесьці выключную чысткасьць, апэрацыйнасьць, паваротлівасьць, шырока асьвятляць і распаўсюджваць перадавы вопыт, рашуча ўскрываючы і бічуючы расхлябанасьць, непаваротлівасьць, неканкрэтнае кіраўніцтва і правааппартуністычныя адносіны да гэтых важнейшых задач з боку асобных арганізацый і камуністаў.

27. Пленум даручае ЦК ЛКСМБ распрацаваць і ўнесьці на разгляд ЦК КП(б)Б усе пытаньні, зьвязаныя з ролай і ўдзелам камсамолу ў барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці і выкананьне пляну веснавой сяўбы.

СНК і фракцыі ЦВК распрацаваць пытаньне аб удзеле і павышэньні ролі саветаў у барацьбе за ўраджайнасьць і выкананьне пляну веснавой сяўбы.

Фракцыі ЦПСБ — аб удзеле ролі прафсаюзаў у барацьбе за ўраджайнасьць і выкананьне пляну веснавой сяўбы.

Абавязаць СНК і Дзяржплян на працягу месячнага тэрміну ўнесьці на разгляд ЦК пытаньні палепшэньня плянаваньня сельскай гаспадаркі і вывучэньне эканомікі раёнаў.

28. Барацьба за павышэньне ўраджайнасьці, далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, падрыхтоўка і правядзеньне веснавой сяўбы будзе праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Рэшткі кулацтва і клясава-варожыя элемэнты будуць імкнуцца арганізаваць сабатаж і супраціўленьне справе барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Таму задача партыйных, савецкіх і земельных арганізацый і кожнага камуніста заключаецца ў тым, каб у яшчэ большай ступені мабілізаваць партыйныя рады, згуртаваўшы масы калгаснікаў і беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў, калгаснікі і аднаасобнікі, перабудаваць усю работу так, каб яна забясьпечвала сапраўднае выкананьне гэтых павышаных патрабаваньняў да ўсіх партыйных, савецкіх і земельных арганізацый.

Неабходна правесьці рашучую ачыстку партыйных арганізацый ад усіх разпажэўшыхся камуністаў, якія фактычна ператварыліся ў простых агентаў клясавага ворага ў радох партыі, зрасьліся з кулацтвам і іншымі клясава-варожымі элемэнтамі, ад усіх тых, якія маюць партбілет у кішэні, але даўно ўжо перарадзіліся і на справе парвалі з партыяй. Толькі пры гэтых умовах, у рашучай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай, з правым і «левым» апартунізмам, з дзедаўскімі традыцыямі і супраціўленьнем укараненьню ў сельскую гаспадарку перадавой тэхнікі і апошніх дасягненьняў навукі—будзе забясьпечана паспяховае правядзеньне мерапрыемстваў партыі па павышэньні ўраджайнасьці, арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, правядзеньні веснавой сяўбы і сацыялістычным перавыхаваньні калгасных мас.

Заява прадстаўніка японскага ваеннага міністэрства

ТОКІЕ, 13. Агэнцтва Сімбун Рэнго паведамляе, што прадстаўнік японскага ваеннага міністэрства, камэнтуючы паведамленьне аб аднаўленьні дыпляматычных адносін паміж СССР і Кітаем, заявіў:

«Аднаўленьне адносін паміж СССР і Кітаем па сутнасьці не датычыцца Японіі. Можна сказаць, што Кітай аднавіў прыязныя адносіны з Савецкім саюзам у выглядзе контрмеры супроць таго, што адносіны паміж Японіяй і СССР за апошні час сталі больш цеснымі. Што-ж датычыць СССР, дык ён заўсёды імкнецца ўстаўляць нармальныя адносіны з магчымы большай колькасьцю краін. Магчыма што, аднаўляючы адносіны з Кітаем, СССР жадае часткова аказаць уплыў на Японію для таго, каб палепшыць ход перагавораў аб заключэньні японска-савецкага пакту аб ненападзе».

„Известия" аб заяве прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў

Адносна заявы прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў «Известия» пішуць: «Прадстаўнік японскага міністэрства замежных спраў у сваёй тэлеграмы з амэрыканскім карэспандэнтам ня скупіўся ў выкарыстаньні самых чорных фарбаў для разрысоўкі ўсіх «жахаў», якія суліць Японіі аднаўленьне савецка-кітайскіх дыпляматычных адносін. Ён паказвае гэту падзею, як нязвычайную, як факт, «найбольш неспрыяючы для Японіі», як пейкую пагрозу і г. д. Кітай ён патрасе за тое, што той аднавіў дыпляматычныя адносіны з Савецкім саюзам, «зрабіў вялікую памылку», «кінуўшыся ў абдымкі Саветаў». Прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў у момант тэлеграмы пакінулі звычайныя для японскіх дыпляматаў вытрымка і спакой. Ён нясумненна ня знаходзіўся ва ўладзе крыку ўзьвішчанага выгбражэньня і раздражэньня.

Нічога нязвычайнага не адбылося. Дзьве дзяржавы—Кітай і СССР—аднавілі паміж сабою нармальныя дыпляматычныя адносіны. Гэты факт умацоўвае справу міру, ён уносіць спакой. А прадстаўнік японскага міністэрства замежных спраў гэтым фактам надзвычай усхваляваны. Адгэтул: рад наўдзвак у яго заяве. Калі Кітай знаходзіцца ў дыпляматычных адносінах з Японіяй, дык гэта добра.. Калі ён будзе знаходзіцца ў такіх-жа адносінах з Савецкім саюзам, дык гэта чамусьці вельмі дрэнна. Калі Кітай знаходзіцца ў дыпляматычных адносінах з Японіяй, дык ён паступае правільна, а калі з Савецкім саюзам—дык ён робіць «вялікую памылку». Калі Кітай падтрымлівае дыпляматычныя адносіны з Японіяй, дык гэта нармальна, а калі з СССР, то гэтым ужо ён «кідаецца ў абдымкі Саветаў». Цяжка ў гэтых разважаньнях прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў знайсьці якую-небудзь пасьлядоўнасьць.

Савецкі саюз няўхільна вядзе палітыку міру і падтрыманьне нармальных адносін з усімі краінамі. У аднаўленьні савецка-кітайскіх дыпляматычных адносін гэта палітыка міру атрымала сваё яркае выяўленьне. Нічога не зьмянілася, нічога надзвычайнага не адбылося. Відавочна вымыслы часткі японскай прэсы наконт усякіх «жахаў» і «пагроз» пачынаюць аказваць сваю дзейнасьць на некаторых японскіх чыноўнікаў.

Нельга ня выказаць зьдзіўленьня адносна тэй часткі заявы прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў, у якой гаворыцца, што аднаўленьне савецка-кітайскіх дыпляматычных адносін значна зьмяншае шансы на заключэньне савецка-японскага пакту аб ненападзе.

Напрошваецца пытаньне: ці не прадназначаны ўсе разважаньні прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў для таго, каб знайсьці яшчэ які-небудзь повад для адхіленьня прапановы Савецкага саюзу аб заключэньні пакту аб ненападзе. Але і тады ў гэтых заявах ёсьць пэўная наўвязка. Савецкі саюз, як раней, так і цяпер, гатоў падпісаць пакт аб ненападзе з Японіяй і Манчжоу-Го. Калі ў Японіі сапраўды расцэньваюць аднаўленьне савецка-кітайскіх адносін так, як аб гэтым заяўляе прадстаўнік міністэрства замежных спраў, дык прасьцей за ўсё было-б пакт аб ненападзе падпісаць і тым самым адхіліць усякія, нават такія няўгрунтаваныя падазрэньні.

Амэрыка адхіляе японскую прапанову аб морскіх узбраеньнях

НЮ-ЕРК. Вашынгтонскі карэспандэнт «Н'ю-Ерк Тайм'с» зазначае, што японскі плян скарачэньня морскіх узбраеньняў **«лічыцца такім фантастычным, што ня можа быць прынятым, і дзяржаўны дэпартамант (міністэрства замежных спраў) ня мае намеру ўносіць яго на разгляд морскага міністэрства».**

Чыноўнікі дзяржаўнага дэпартаманту зазначаюць, што ёсьць прапановы зусім не ад казваць на японскую прапанову на працягу некаторага часу. Выказваецца думка, што японскі плян і **«не разлічан на тое, каб яго сур'ёзна разглядаць і, магчыма, запрапанаваны толькі з мэтаю ўнесьці яшчэ большую неяснасьць у створанае між народнае становішча, з тым, каб Японія тым часам магла яшчэ больш умацаваць свае пазыцыі ў Манчкурыі».**

Экспэрты па пытаньнях узбраеньня лічаць,—указвае далей карэспандэнт,—што японскі плян прадугледжвае амаль поўнае ўраўнаньне магутнасьці японскага і амэрыканскага флётаў. Указваючы, што Злучаныя Штаты будуць лярочыць супроць многіх дэталяй японскага пляну, калі ён калі-небудзь будзе сур'ёзна абмяркоўвацца, карэспандэнт напамінае неаднаразовыя заявы Стымсона, накіраваныя супроць скарачэньня тонажу паасобных катэгорый баявых суднаў.

Закрываючы японскую прапанову павялічыць тонаж падводных лодак, карэспандэнт гаворыць: **«Экспэрты лічаць, што Японія, улічваючы раскіданасьць сваёй тэрыторыі, жадае мець выстарчальны падводны флёт для абароны камунікацый з Азіяцкім сухазем'ем, а таксама скарыстаць падводны флёт для нападу на Філіпіны ў выпадку вайны са Злучанымі Штатамі».**

(ТАСС).

Уплыў кампартыі ў польскай вёсцы моцна вырас

ВАРШАВА, 12. 10-11 сьнежня г. г. у Варшаве адбываліся пасяджэньні кіраўніцтва кулацкага блёку, у якіх прынялі ўдзел звыш 200 прадстаўнікоў былых груп «Пяст», «Вызваленьне» і «Стронніцтво хлопскае», якія выступаюць зараз пад агульнай назвай «Стронніцтво людове». Асабліва вялікую зацікаўленасьць да гэтых пасяджэньняў выклікала апублікаваньне ў прэсе інтэрв'ю Вітаса (вядомы сваёй дэмагогіяй). Вітас заявіў нібы, што ён высоўвае лёзунг «зямля сялянам бяз выкупу». Інтэрв'ю кулацкага цэнтра было камэнтавана газэтамі ўсіх палітычных напрамкаў, як паварот былога прэм'ера «Гулева». Афіцыёз «Газэта польска» аднаўчыў палітычнае двурушніцтва Вітаса, які чэрпаўна рабалепстваваў перад кулацкімі групоўкамі і ўзначальваў рэакцыйны ўрад.

«Газэта варшаўска», адзначаючы, што яна ня зусім верыць паведамленьням аб тым, што Вітас нібы выказаўся аб перадачы зямлі сялянам бяз выкупу, тут-жа заяўляе: «Няма дыму без агня. Атмасфэра ў краіне спрыяе росту незадаволеньня, спрыяе абвастрэньню страсьцей»...

Яснасьць у створанае становішча ўнёс сам Вітас, які выступіў у прэсе з заявай, што яго фальшыва зразумелі: «ня ён асабіста, а сялянскія масы высоўваюць лёзунг «зямля бяз выкупу».

Паводле прызнаньня раду буржуазных газэт, **моцна вырас уплыў кампартыі ў польскай вёсцы.** Баючыся страціць рэшткі свайго ўплыву, кулацкія дзеячы прымушаны высоўваць найбольш «радыкальныя» лёзунгі. Да якіх межаў даходзіць дэмагогія «Стронніцтва людовага» відаць з артыкулу, зьмешчанага ў кулацкім «Вызваленьні». У артыкуле, зьмешчаным пад загалоўкам «Чаго патрабуюць сяляне» гаворыцца: «Голас народу, голас мільёнаў патрабуе грамадзкай справядлівасьці, зямлі, улады і ведаў. Голас гэты павінен быць пачуты, бо ён мае сілу стыхіі. У краіне становішча ўсё больш і больш абвастраецца: палявыя суды, кары сьмерцю... Што-ж далі палявыя суды? Ці палепшылася становішча?

Напады, грозьбы, як трэба было ждаць,—весь што адбываецца ў результаце голечы і голаду. Зараз ніхто сьмерці не баіцца. Мільёны будуць усклікаць магутным голасам: «Досыць дыктатуры і ўсялякіх несправядлівасьцяй. Патрабуем права і справядлівасьці для ўсіх, патрабуем роспуску сойму, патрабуем назначэньня новых справядлівых выбораў».

Кулацкі орган стараецца накіраваць рэвалюцыйнае незадаволеньне мас на шлях дэмакратычных патрабаваньняў. Надобная тактыка «Стронніцтва людовага» адбілася таксама і ў пастановах, ухваленых на чарговым пасяджэньні кіраўніцтва. У іх, зразумела, няма патрабаваньняў аб перадачы «зямлі сялянам бяз выкупу». Замест гэтага ёсьць толькі ўказаньне, што ўрад «павінен больш актыўна праводзіць аграрную рэформу».

Ні слова таксама няма аб «канцы капіталізму». Замест гэтага выстаўлена «дэмакратычнае» патрабаваньне скліканьня новага сойму. Заявамі, якія ні да чаго не абавязваюць, аб «барацьбе з дыктатурай легальнымі мэтадамі» Вітас і яго «Стронніцтво людове» **хочуць захаваць свой уплыў і стрымаць рэвалюцыйны націск сялянскіх мас.**

Ацэньваючы вынікі пасяджэньняў кіраўніцтва «Стронніцтво людове», афіцыёзная «Газэта польска» піша, што Вітас «стаў больш пакладзістым». «Дарэмна працаваў-бы,—заяўляе газэта,—той, хто прабаваў-бы ў пастановах «Стронніцтва людовага» знайсьці сьляды выступленьня Вітаса аб зямлі сялянам бяз выкупу. Вітас лічыць за лепшае сядзець паміж двух крэслаў, дагаворваючыся з «левымі» аб адзінстве дзеяньняў і адначасова какетнічаючы з правымі».

Афіцыяльныя колы занепакоены, аднак, не на жарты ростам рэвалюцыйных настроеў у вёсцы. Яны ўлічваюць, што сялянская барацьба можа перахліснуць праз рамкі вітасаўскіх «легальных сродкаў барацьбы». Не абмяжоўваючыся простым тэрорам, урад прабуе стварыць сваю чыста фашысцкую апору ў вёсцы. Такой арганізацыяй зьяўляецца група «Стронніцтва рольніча», створаная з дзеячоў, якія адкалоліся ад Вітаса, і ўзмоцненая «сялянскімі дэпутатамі беспартыйнага блёку» (пілсудчыкі). Кіраўніцтва гэтай групы засядала ў Варшаве адначасова з вітасаўскім «Стронніцтвам людовым». У апублікаваных рэзалюцыях «Стронніцтва рольніча» чытаем: «Выканаўчы камітэт зьвяртаецца да шырокіх сялянскіх мас у імя ўласнага дабра з заклікам ня прыслухоўвацца да д'абальскіх нашэптываньняў агітатараў, якія заклікаюць да злачынных антыўрадавых выступленьняў». Рэзалюцыя заклікае сялян «стаць на варце дзяржаўнасьці». (ТАСС).

СЬПІС

таварышоў, якія выяжджаюць у раёны па пытаньні разьмеркаваньня даходаў у калгасах

Пікупік—асьпірант 2-га курсу балотнага інстытуту (член партыі з 1931 году); **Бабіч**—навуковы працаўнік балотнага інстытуту; **Давыдоўскі**—навуковы працаўнік інстытуту; **Саламонаў**—нач. рэспубліканг. касы НКПрацы; **Фэльдман**—старш. консультант СНК; **Саронін**—загалчык сэктару збожжавага трактарацэнтру; **Вераценьнікаў**—загалчык сэктару ільнаводнага трактарацэнтру; **Лун'яновіч**—заг. сэктару гародня-бульбяного трактарацэнтру; **Мэтлюк**—нам. дырэктара Белшлодагародніны; **Папякоў**—асьпірант БАН; **Лядоўскі**—асьпірант БАН; **Бушэтэйн**—асьпірант БАН, **Бронштэйн**—навуковы працаўнік БАН; **Чэцьвярыкоў**—навуковы працаўнік БАН; **Герман**—асьпірант БАН; **Лысянькоў**—навуковы працаўнік БАН; **Бендаренка**—навуковы працаўнік БАН; **Раманенка**—нам. нач. прамсэктару Дзяржпляну; **Яненіс**—нам. пракурора НКЮ; **Гурко**—пам. пракурора НКЮ; **Хайкін**—нач. сэктару эканом працы і кадраў Галоўдарпрансу; **Драноў**—нач. васеннага сэктару Галоўдарпрансу; **Рубінчык**—аддзел кадраў ЦК; **Анодэін**—дырэктар НДІ пры Наркамснабе; **Рэсін**—дырэктар саюздруку НКСувязі; **Наўмёнак**—нач. радыёаддзелу НКСувязі; **Фрэйдэін**—дырэктар паспадарчай пры НДІ сыпнагалоўлі; **Дабравольскі**—кіраўн. сэктару масповай прамысловасьці НКЛёгпраму; **Краўцоў**—нам. кір. Белгеаразьведкі; **Цофін**—дырэктар лугтрэсту; **Мажуцін**—заг. жывёлагадоўчага сэктару НКЗему (б. старш. РВК); **Грыневіч**—член праўленьня жывёлагадоўчага аб'яднаньня Наркамзему; **Марозаў**—нам. старшыні Белбюро НКЗему; **Аўчыньнікаў**—член праўленьня жывёлагадоўчага аб'яднаньня НКЗему; **Сокалаў**—заг. сэктарам НКЗему; **Чарняўскі**—упаўнаважаны каняводкалгасцэнтру; **Ляшкевіч**—заг. сэктару лясоў масповага значэньня НКЗему; **Белзаус**—навуковы працаўнік саўгаснага інстытуту (кандыдат партыі); **Лебядзінскі**—нам. нач. сэктару палітасьветы НКА; **Бурачкоў**—інструктар плянавага сэктару НКА; **Рубінчык**—ЦК аддзел кадраў; **Сушкевіч**—заг. сэктару Белдзяржсьпірту (сакратар парт'ячэйкі); **Жук**—дырэктар тэрфінстытуту; **Драгінскі**—ЦК прам жывёлы (член правяраючай); **Славін**—аддзел сакратар сувязі; **Пагост**—ЦК мукамольнікаў, чл. правяраючай; **Кагановіч**—аддзел сэктар ЦП сельпрам.; **Лашко**—сапбытсэктар ЦПСПБ; **Гейфман**—ЦК кааперацыі Дзяржпляну (інструктар); **Рубін**—культмасавы аддзел ЦП МТС; **Жмяўскі**—інструктар ЦП Парткнігабуд; **Саламонаў**—адказны выканаўца наркомбуда ПСПСБ; **Крэйчанка**—ЦК жывёлагадоўлі; **Горскі**—нам. упаўнаважн. гародніябульбян. трэст таталэнтару; **Мільлер**—нач. інструкт. сэктару ЦКЗ; **Сяньчук**—нач. Белдзіярафа'ізацыяпрам; **Бакун**—нам. дырэктара Бактэрыял. інстытуту (чл. партыі 1919 г.).

СЬПІС

дакладчыкаў, вылучаных ГК КП(б)Б для працяцкі сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б на куставых сходах вёскі на 17 сьнежня

Першы куст: Саўгас «Тарасава», яч. Вараўская, яч. Гатаўская, калгас імя Варашылава—адказны от скліканьне **Лабанаў**, дакład. **Лебядзеў** (БІМЗО).

Другі куст: саўгас «Вішнёўка», саўгас «Бальшавік», саўгас «Камсамолец», яч. Пагарынская—адказны за скліканьне **Луцэвіч**, дакład **Клімаў** (ЦК).

Трэці куст: саўгас 1 мая, саўгас «Курганы»—адказны за скліканьне **Папкоў**, дакład. **Прокопчык** (саўгасны інстытут).

Чацьверты куст: Асіпашыцкі Гарадок—адказны т. **Жаўрык**, дакład. **Люцыко** (гарсавет).

Пяты куст: саўгас «Русановічы», «Лопіцкі шлях», «Самахвалавічы»—адказны за скліканьне **Матусевіч**, дакład. **Барысевіч** (калгасны інстытут).

Шосты куст: саўгас імя Калініна, яч. Гатаўская—адказны за скліканьне **Бортнік**, дакład. **Папоў** (асьпір. калг. ін-ту).

Сёмы куст: саўгас «Самуйлова», яч. Крупінская—адказны за скліканьне **Пешкевіч**, дакład. **Новікаў** (Наркамзем).

Восьмы куст: яч. Кайкаўская, Міханавічская—адказны за скліканьне **Сьмірноў**, дакład. **Драгун** (ГК).

Дзевяты куст: яч. [illegible] дакład. **Хмель** (ГК).

Дзесяты куст: Н.-Дворская, Запішанская, «Лошыца»—адказны за скліканьне **Мацюкоў**, дакład. **Янубовіч** (гарс.).

Адзінаццаты куст: яч. Каралішчанская—дакład. **Кукелка** (БАН).

Дванаццаты куст: яч. Трасьцянецкая—адказны за скліканьне **сакратар парт'ячэйкі**, дакład **Раманенка** (Дзяржплян).

Трынаццаты куст: «Абтаг-Горкі», Зэмастоцкая ячэйка—адказны за скліканьне **Барушка**, дакл. **Данілевіч** (ГК).

Чатырнаццаты куст: яч. Прылуцкая—дакład. **Сямёнаў** (ЦК).

Пятнаццаты куст: Спрочыцкая яч., саўгас «Строчыца»—адказны за скліканьне **Карнейчык**, дакład. **Тамашэўскі** (Тэакстамэнтр).

Шаснаццаты куст: яч. Грычанская, калгас Фалько—адказны за скліканьне **Паталаў**, дакład. **Мажуеў** (ГК КП(б)Б).

Сямнаццаты куст: Сеньніцкая яч. саўгас «Сеньніца», ЗРК «Бальшавік», ЗРК «Аскадбр»—адказны **Ненагляды**, дакład. **Касьцюковіч** (Дзяржплян).

Васямнаццаты куст: калгас імя Дзяржынскага, калгас «Праца», імя ДПУ — адказн. **Лікарпенка**, дакład. **Шэлег** (МТС).

Дваццатнаццаты куст: калгас «Вольная праца», калгас «Чырвоны транспартнік»—дакład. **Есялеў** (с.-г. тэхнікум).

Дваццаты куст: саўгас імя Лекерта, саўгас «Чырвоны маяк»—адказны за скліканьне **Гірасімчык**, дакład. **Салей** (БАН).

Дваццаць першы куст: «Зялёны луг», «Новы сьвет»—адказны за скліканьне **Шырэц**, дакład **Ждановіч** (ГК);

Дваццаць другі куст: МТС. саўгас «Сапежаны» — адказны за скліканьне **Мацюкоў**, дакład. **Пэўловіч** (ГК).

Сакратаром парткалектываў дагаварыцца з вылучанымі дакладчыкамі канчаткова аб дні і часе сходу.

Культпроп ГК КП(б)Б **ГРЫЦКЕВІЧ.**

Заява прадстаўніка японскага міністэрства замежных спраў

ТОКІЕ, 13. Прадстаўнік міністэрства замежных спраў у гутарцы з амэрыканскім карэспандэнтам заявіў, што аднаўленьне дыпляматычных адносін паміж Кітаем і СССР зьяўляецца «найбольш неспрыяючым для Японіі». Прадстаўнік міністэрства замежных спраў указаў:

«Элемэнты, якія найбольш пагражаюць усеагульнаму міру, цяпер падалі адзін другому руку. Японія стаіць непасрэдна супроць гэтых сіл. Перад дзяржавамі паўстае пытаньне, каму прадставіць панаваньне на ўсходзе: ці сілам разбурэньня, ці сілам кансалідацыі. Аднаўленьне дыпляматычных адносін паміж Кітаем і Савецкім саюзам ставіць гэта пытаньне канкрэтна. У параўнаньні з ім будучыня Манчжурыі не адыгрывае значнай ролі».

Далей прадстаўнік міністэрства замежных спраў адзначыў, што Карахан за суткі паведаміў Амо аб дасягненьні згоды паміж СССР і Кітаем. Прадстаўнік міністэрства падкрэсьліў, што ў результаце гэтай падзеі шансы на заключэньне савецка-японскага пакту аб ненападзе значна зьменшыліся.

Далей прадстаўнік міністэрства заявіў:

«Што датычыць Кітая, дык ён зрабіў вялікую памылку, аказаўшы дыпляматычныя адносіны з Савецкім саюзам. Кучка генэралаў і палітыканаў, якія знаходзяцца на чале ўлады ў Нанкіне, спадзяючыся фактычна выйграць у барацьбе з Японіяй, адмовілася ад дасканалай стратэгічнай пазыцыі, бо кінуўшыся ў абдымкі Саветаў, Кітай нясумненна ў значнай ступені пазбавіцца сымпатыі дзяржаў».

Прадстаўнік міністэрства замежных спраў лічыць неабходным асабліва спыніцца на тэй частцы інтэрв'ю тав. Літвінава, у якой гаворыцца, што «цяперашняя падзеі па далёкім Усходзе ў значнай ступені зьяўляюцца рэзультатам таго становішча, што нармальныя дыпляматычныя адносіны, устаноўленыя не паміж усімі краінамі Ціхага акіяну».

Па думцы прадстаўніка міністэрства замежных спраў, **«відавочнае значэньне гэтых слоў зводзіцца да таго, што СССР і ПАЗШ нібыта супольна маглі-б спыніць японскі курс і на азіяцкі кантынэнт. Выходзіць, што імкнучыся дабіцца прызнаньня з боку ПАЗШ, Літвінаў адначасова ўкоска пагражае Японіі. Калі СССР думае аб магчымых канбінацыях дзяржаў, накіраваных супроць Японіі, дык які-ж сэнс гаварыць аб пакце ненападу?»**

Усе газэты сэнсацыйна публікуюць паведамленьні з Жэнэвы аб аднаўленьні дыпляматычных адносін паміж СССР і Кітаем. Многія газэты выпусьцілі экстраныя выпускі, прысьвечаныя гэтаму пытаньню. Накуль толькі газэта «Дэй-дэй» публікуе інтэрв'ю тав. Літвінава. Усе газэты зьдзіўляваюцца ад камэнтаваньня гэтых паведамленьняў.

Пакінаньне Польскага дзяржтэатру Савецкая, 28 тэл. 15-20

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР ЦСПСБ

СЁНЬНЯ

КОНТР-АТАКА

Частаўоўка В. Я. Галавачынера.

Мастак Дзясьніцкі.—Мантан—музыка Кнаўэ і Гітліц.

Пачатак роўна ў 8 г. 30 м.

Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру.

СЁНЬНЯ

у 12 гадз. дня, у Ін-це літаратуры і мастацтва Акад. Навук БССР (III паверх, пак. 39) акад. І. Замоцкім будзе зроблен дакład

аб творчасьці Крапівы.

Запрашаюцца пісьменьнікі, настаўнікі, студэнты і ўсе жадаючыя.

Дырэктарыят Ін-ту ЛІМ.

10-ы ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ

ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ

жывёл і птушак.

Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. ве-ара штодзенна.

Па здаволіўных заўчах представляецца 50 проц скідкі. Зварачацца ў кантору зьвярынцу загадзя.

СЁНЬНЯ, а 7 гадз. увечары, у ЦК КП(б)Б

— склікаецца —

ІНСТРУКЦЫЙНАЯ НАРАДА

ад'яжджаючых у раёны па пытаньні ўзьмеркаваньня даходаў у калгасах. Лука пераменаваных таварышоў у сьпісе абавязкова.

Збор у залі пасяджэньня ў бюро.

СЁНЬНЯ, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні вялікай залі дому Камасьветы (вул. К. Маркса) **адбываецца**

ПЕРШАЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ДРУКУ ПА ПЫТАНЬНЯХ АБАРОНЧАЙ РАБОТЫ

Из порядку дня нарады стаяць наступныя пытаньні

1. Задачы абарончай работы друку—дакладчык т. **Васьковіч (ЦК КП(б)Б).**
2. Ход перабудовы работы асоавіяхімаўскіх арганізацый і задачы раённых газэт—дакладчык тав. **Паромчык** (ЦС Асоавіяхіму БССР) **і т. Вержбаловіч** („Рабселькор")
3. Вопыт абарончай работы лепшых гарадзкіх і раённых газэт **(даклады з месц)**
4. Пашырэньне выдавецтва кандыдатаў з ліку гарадзкіх, раённых і ніавых газэт) на ўсебеларускае і ўсесаюзнае прэміраваньне за лепшую работу на правядзеньні ўсесаюзнага агляду ніавых ячэек Асоавіяхіму.

Для ўдзелу ў рабоце нарады, апрача дэлегатаў, запрашаюцца: работнікі цэнтральных газэт, рэдактары і рабкоры ніавога друку Менску, студэнты КУТК і газэтнага аддзяленьня ВПІ, партыйны, камсамольскі і асоавіяхімаўскі актыў.

Запрашальныя білеты выдаюцца ў рэдакцыі газ. „Рабселькор" і Менскім гарадзкім савеце Асоавіяхіму.

Культпроп ЦК КП(б)Б
Рэдакцыя газэты „Рабселькор"
ЦС Асоавіяхіму БССР

ВЫ павінны абавязкова глядзець і слухаць гукавы мастацкі фільм

СУСТРЭЧНЫ

ПРОМ'ЕРАЙ тэатры дня ў кіно-тэатры **„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"**

Прымаюцца заяўкі на калектыўныя і мэтавыя сэансы.

Каб на было наплыву і чэргі на фільм „Сустрэчны",

пачатак сэансаў з 2-х гадз. дня.

Каса адкрыта з 12 гадз.

ДА ВЕДАМА

усіх трымальнікаў білетаў 3-й лятэрэі Аўтадор
усіх дзяржпрацашчадкас
усіх аддзяленьняў і кантор дзяржбанку.

Лётарэйны камітэт цэнтральнага савету таварыства Аўтадор СССР, галоўнае кіраўніцтва дзяржпрацашчадкас і дзяржрэдыту НКФ СССР і праўленьне Дзяржбанку, даводзяць да ведама ўсіх трымальнікаў білетаў 3-й лётарэі Аўтадор, што выплата выйгрышаў грашыма ў сумах 4, 10 і 12 рублёў праводзіцца ўсімі дзяржпрацашчадкасамі і ў 4, 10, 12, 40 і 80 рублёў усімі канторамі і аддзяленьнямі Дзяржбанку неадкладна па прадъяўленьні выйграўшых білетаў.

Усім ашчадкасам і канторам дзяржбанку прапануецца бесперашкодна праводзіць аплату выйгрышаў, кіруючыся заключнай згодай паміж Аўтадорам і галоўным кіраўніцтвам дзяржпрацашчадкас і дзяржрэдыту ад 12 верасьня 1931 г. і аўтадорам і праўленьнем дзяржбанку ад 16 верасьня 1931 г.

Аплата выйгрышаў грашыма ад 120 рублёў і вышэй, а таксама ўсіх выйгрышаў натурай праводзіцца лётарэйным камітэтам ЦС Аўтадору пераднам, указаным у тыражных таблицах.

Нам. адказн. сакратара лётарэйнага камітэту ЦС Аўтадору **Астамбоўскі.**

Галоўнае кіраўніцтва Дзяржпрацашчадкас і Дзяржрэдыту НКФ СССР **Таранжнаў.**

Праўленьне Дзяржбанку **Скосырэў.**

ПРЫГАРАДНАМУ САЎГАСУ „ЗАРЯ ЗАПАДА"

ПАТРАБУЮЦЦА

работнікі наступных спэцыяльнасьцяй:

БУХГАЛЬТАР-ФІНАНСІСТ,
ЭКАНАМІСТ-ПЛЯНАВІК, АГРАНОМ,
ТЭХНІК-ЖЫВЁЛАВОД,
ТЭХНІК-ПАЛЯВОД,
РАХУНКАВОДЫ—3,
САДОЎНІК-ГАРОДНІК,
САКРАТАР-СТАТЫСТЫК.

Прадстаўляецца кватэра.

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

ЗА ДАВЕДКАМІ ЗВАРАЧАЦЦА—САВЕЦКАЯ, 70, СЬВІНАБОЛТРЭСТ, ДЫРЭКЦЫЯ САЎГАСУ.

Чырвоная Зорка Каса ад 3-г. дня

Новы мастацкі фільм **ТРЫ САЛДАТЫ**

СПАРТАК Каса ад 3-г. дня

Гарояд. Ад. Ушакова. Фільм **МАЛОДШЫ СЫН** ДЭМАНСТРУЕ 8 ЧАСТЯЎ

Інтэрнацыянал Каса ад 12-г. дня

Мастацкі фільм **У горадзе заходзіць вальга**

Пролетарый

Выгарэць дашчыста пат у пяцігадзіўцы (у кампаніі)

ПАЧАТАК КАРЭРЫ

Дзесяньні дзіцячыя сэансы **БОЙКІ ЖЫЦЬЦЯ**

У адзел аб'яў званне па тэлефону 7-81

Клюб харчавікоў імя Сталіна

Сёньня адбываецца

ВЯЛІКІ СЫМФАНІЧНЫ КАНЦЭРТ

аркестру Белкамітэту радыёвяшчаньня

пад кіраўніцтвам дырыжэра **І. А. ГІТГАРЦА**

пры ўдзеле прафэсара Ленінградзкай кансэрваторыі **І. РЭЗІНА.**

ПРАГРАМА: Чайкоўскі, Ліст, Вагнэр.

Пачатак у 9 гадзін вечара.

НАВУЧАЛЬНЫ СЭКТАР БЕЛ. К-РЫ

„СОЮЗОРГУЧЕТ"

даводзіць да ведама, што ім

з 15 сьнежня г. г. арганізуецца

ГРУПА СТАРШЫХ БУХГАЛЬТАРОЎ

для сыстэмы **Белдзяржсьпірта** (тэрмін заняткаў 6 месяцаў)

На курсы прымаюцца бухгальтары і панбухгальтары са стажам 1 году і р